СУТНАСЦЬ РЭФОРМЫ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСА

З прамовы тав. Н. М. ГАЛАДЗЕДА на прыёме дэлегацыі пісьменнікаў, настаўнікаў і навуковых работнікаў

Дэкрэт урада БССР аб рэформе беларускага правапіса — дакумант найвялікшай палітычнай важнасці. Гэты акт — магутная зброя ў барацьбе за ленінскі інтэрнацыяналізм, за далейшы росквіт беларускай культуры і, у прыватнасці, мовы.

Яго значэнне перш за ўсё ў тым, што ён рашуча ачышчае беларускую мову ад варожых уплываў контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызма, ад сярэднявяковых архаізмаў і буржуазных вульгарызмаў, насаджаных беларускай нацыяналістычнай контр-рэвалюцыяй.

Пролетарыі, калгаснікі і ўсе працоўныя нашай краіны атрымліваюць найшырэйшыя магчымасці для сапраўднага вывучэння беларускай пісьменнасці.

Дэкрэт СНК узбройвае масы на барацьбу за пролетарскі інтэрнацыяналізм, за нацыянальную палітыку Леніна-Сталіна.

Наш дэкрэт выклікаў цэлы пераналох, воўчы лямант у лагеры замежных нацыянал-фашыстаў. Луцкевічы, Астроўскія, Станкевічы і таму палобныя агенты імперыялізма завылі аб «паходзе на беларускую мову», аблліваючы наш дэкрэт чатокамі гнуснай хлусні.

Раз ворат шалее ад бяссільнай злобы, стала быць, удар трапіў у цэль. Шалёнства замежных нацыянал-фашыстаў зусім зразумела. Іра дажныя прыхвасні фашызма бачаць крах сваіх антысавецкіх інтэрвенцыянісцкіх планаў, разгром сваіх адма думцаў — унутранай нацыяналістычнай контр-рэвалюцыі — беларускіх нацыянал-дэмакратаў.

Было б адлак, шкодная памылкай думаць, што справа вырашаецца адным апублікаваннем дэкрэта. Задача заключаецца ў найшырэйшай прапагандзе палітычных задач рэформы беларускага правапіса, у шчодзеннай настойнай барацьбе за іх практычнае ажыццяўленне.

Сённяшняя Беларусь—зусім іншая Беларусь, чым яна была не толькі да Окцябрскай рэвалюцыі, але яшчэ і 6-7 год назад. Няма цяпер «палеска-лапатай» Беларусі. Ёсць індустрыяльна-калгасная БССР. Мы вырасцілі, гігантыі вырасцілі і расцём.

Нашы гарады становяцца буйнымі пролетарскімі цэнтрамі, у якіх пабудаваны і будуюцца гіганты соцыялістычнай індустрыі. Плуг рэвалюцыі глыбока пераараў палі былой хутарской Беларусі. У калгасах расце новая матэрыяльная культура, культура навейшай машыннай тэхнікі, культура трактараў, камбайнаў.

Мова — участак класавай барацьбы. Яе рост, развіццё, узбагачанне новымі словамі залежыць ад соцыяльна-эканамічных умоў, ад вытворчых адносін.

вукова» ас[illegible] сваю раз'юшаную камп[illegible] супроць нашай рэформы, як бяссільны іх спробы «навукова» даказаць, што наш дэкрэт «русіфікуе беларускую мову».

БССР індустрыялізуецца. Наша тэхніка расце не па днях, а па гадзінах і ў сувязі з гэтым прыбаўляюцца ўсё новыя і новыя рэчы, якіх раней беларускія рабочыя і сяляне нават і не бачылі. Не бачылі мы раней камбайна, не бачылі трактараў, не бачылі гігантаў індустрыялізацыі, узброеных навейшай тэхнікай, якія высяцца зараз на абшарах БССР і ўсёй краіны Саветаў.

Цяпер усё гэта ёсць. З'явілася багацейшая колькасць новых матэрыяльных рэчаў, а стала быць і новых слоў, новых назваў. З ростам нашай індустрыі, тэхнікі, калгаснага будаўніцтва абагачаецца, напаўняецца, шпарка развіваецца далей і беларуская мова.

Якая-ж патрэба перарабляць, выдумваць новыя назвы тых рэчаў, якія прыходзяць к нам у жыццё, у быт, на вытворчасць. Такой патрэбы няма і не можа быць.

У беларускай мове ёсць слова «лампа». Гэта не беларускае слова, але ім шырока і штодзённа карыстаюцца і на Заходняй Беларусі, і ў нас у БССР. Яно прывілося ва ўсіх нашых слоўніках, як карэннае слова. Лампа вынайдзена не ў нас, не ў Беларусі і не ў Расіі, а ў Германіі. Гэта слова прывілося і ў беларускай і ў рускай мовах і ні адзін моваазнаўца не рызыкне прапанаваць выкрэсліць гэтае слова. Не павярнуўся язык зрабіць падобную прапанову і ў нацдэмаў, хоць слова «лампа» — зусім не беларускае слова.

У даным выпадку Луцкевічы і Астроўскія і ле думаюць «ачышчаць» лямант аб «паходзе» на беларускую мову, аб тым, што яна «русіфікуецца».

А вось, калі да нас прыходзіць трактар з поршнем і мы называем гэтыя рэчы так, як яны называюцца — трактарам і поршнем, а не нейкімі вымяжанымі з пальца «саўгаламі», то ўся гэта нацыянал-фашысцкая эграя пачынае выць аб «паходзе»...

Такава яна, «абгрунтаваная» ненавісць нацыянал-фашысцку.

Наш дэкрэт уводзіць рад інтэрнацыянальных слоў, якія будуць пісацца не па правілу беларускага «вяння», а праз «о», скажам, «словы «социялізм», «революцыя», «комунізм», «большэвік», «совет».

Што трапіць беларуская мова ад гэтага, ці ёсць гэта «русіфікацыя»?

Пролетарскі інтэрнацыяналізм — баявы сцяг нацыянальнай палітыкі ЛЕНІНА-СТАЛІНА.

Дэкрэт СНК — новы і смелы рашучы крок наперад па шляху інтэрнацыяналізацыі нашай мовы, па шляху росту мовы, выхавання [illegible]

што яно ўзнікла ў рускай мове і сімвалізуе сабой цэлую соцыяльна-палітычную эпоху, палітычны рух пролетарыята. Для старога грамадства, для капіталізма яно сімвалізуе іх пагібель. Для нас, для сусветнага пролетарыята, яно — сімвал, сцяг барацьбы за справу міжнароднай пролетарскай рэвалюцыі, за справу комунізма.

Слова «комуна» з часоў Парыжскай комуны стала сімвалам, сцягам класавай барацьбы для пролетарыяў усяго зямнога шара. Слова «со-

вет» — сімвал дзяржаўнай формы дыктатуры пролетарыята. Чаму-ж нам гэта слова «совет», наша крылатае слова, не пісаць так, якім яно ёсць? Слова «совет» у нашым разуменні сцяг, пад якім пролетарыят перамог у дні Окцябрскай рэвалюцыі на чале з партыяй Леніна, і таму Луцкевічы і Астроўскія так сяпцяць, так шалеюць ад гэтага слова.

Рэформа беларускага правапіса зусім яшчэ не азначае, што з буржуазным нацыяналізмам ужо ўсё пакончана, што нацыянал-дэмакратызм плыве канчаткова выцяты. Мы ачышчаем фокус, а змест павінен быць яшчэ ачышчан. І тут необходзіць правільная класавая пільнасць, мабілізацыя ўсіх нашых навукова-культурных сіл, усёй пролетарскай грамадзкасці.

Найлепшая згодна правілам любога правапіса — пісаць так, як беларускага слова «саўтач». Ці вы напішаце на беларуску — «саўтач», ці па руску — «совгач» — змест не мяняецца, і ў першым, і ў другім выпадках гэта слова з'яўляецца непрамудлым, чужым і для беларускіх рабочых і сялян, і для рускіх рабочых і сялян, бо яно чужароднае, выдуманае з навуковых [illegible]

усімі гэтымі Луцкевічамі, Астроўскімі, Станкевічамі і іх прыхвасням, падпяўшымі дзікае выццё па поваду нашай рэформы. Няхай сабе выюць гэтыя прыхвасні фашызма.

Усім працоўным нашай краіны добра вядома ўся подлая і гнусная дзейнасць асістэнтаў Луцкевіча па падрыхтоўцы вайны, усіх гэтых Лёсікаў, Ластоўскіх і Некрашэвічаў і Ко, верных і паслухмяных лакеяў фашызма і заграніччных контрразведак.

Для поўнай характарыстыкі неабходна спынімся, адпак, і на сучасных Лёсіках. Хто яны?

Гэта — **Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Гаўрылюк, Дварчанін, Валошын** і інш., падасланыя, як аказалася, для контр-рэвалюцыйнай работы ў нашай краіне, для падрыхтоўкі адрыва БССР ад СССР шляхам імперыялістычнай інтэрвенцыі.

Прадаўшыся фашызму, прадаўшы ся капіталістам і памешчыкам, гэтыя адрадзінкі, гэтыя заклятыя ворагі рабочых і сялян БССР прыехалі да нас, каб ажыццяўляць свае планы, свае імкненні аб ператварэнні БССР у калонію фашызма.

Вось што гаворыць у сваіх паказаннях адзін з іх:

Канчатковай мэтай нашых палітычных патрабаванняў з'яўлялася (г. зн. іх контррэвалюцыйнай арганізацыі, якую яны стварылі, прыехаўшы на тэрыторыю БССР) стварэнне на аб'яднаных беларускіх землях «Беларускай дэмакратычнай рэспублікі» па тыпу капіталістычных краін. У склад гэтай рэспублікі павінны былі ўвайсці, з аднаго боку, землі Заходняй Беларусі, якія Польшча павінна была ўступіць нам добраахвотна, па згодзе, з другога боку, беларускія землі, уваходзячыя ў склад тэрыторыі СССР (прычым яны прасіраліся значна ўсходней цяперашніх межаў БССР), якія павінны быць адабраны ад СССР сілай узброенага паўстання. На поўдні ўстанаўленне граніц мяркавалася зрабіць па добраахвотнай згодзе з новай быць такой-жа «Украінскай дэмакратычнай рэспублікай», а на поўначы ў склад «БНР» намячалася ўключыць беларускія землі, уваходзячыя ў склад цяперашніх Літвы і Латвіі. Калі апошнія не згадзіліся-б на аддачу гэтых земляў добраахвотна, мяркавалася заняць іх сілай узброенага ўзбраення.

Гаспадарчая сістэма краіны павінна была быць капіталістычнай, заснаванай на прынцыпе прыватнай уласнасці, замацаванай у праграме свяшчэннай».

Вось чаго дабіваліся, вось аб чым

«Праект праграмы быў складзен кіруючым палітычным цэнтрам беларускай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі яшчэ ў Вільні ў 1926 годзе. Аўтары яго былі: Рак-Міхайлоўскі, Луцкевіч, Дварчанін і Гаўрылюк, і была прынята затым на агульным пасяджэнні «Палітычнага цэнтра ў Вільні ў 1928 г.

Кандыдатам на першага прэзідэнта «БНР» быў намечан ЛУЦКЕВІЧ».

Кандыдатура Луцкевіча на пост прэзідэнта фігуравала яшчэ ў 1926 годзе, калі нацдэмы збіраліся на акадэмічную канферэнцыю ў Менску. Толькі тады ішлі спрэчкі каго лепш — Ластоўскага ці Луцкевіча. Толькі ў гэтым і былі ў іх разыходжанні.

Прыведзеныя намі дакументы паказваюць, што Гаўрылюкі, Рак-Міхайлоўскія, Валошыны і К-а, прыехаўшыя ў БССР, арганізавалі контррэвалюцыйную, шпіёнска-нацыяналістычную арганізацыю «Беларускі нацыянальны цэнтр» («БНЦ»).

Гэты «БНЦ», як аказалася, арганізацыйна падначальваўся Палітычнаму цэнтру ў Вільні, на чале якога стаіць Луцкевіч. Зразумела, чаму ўсе гэтыя Луцкевічы, Астроўскія і Станкевічы павялі такую дзікую кампанію супроць нашай рэформы, чаму іх смяротна перапалохаў наш дэкрэт.

Наша рэформа беларускага правапіса—далейшы і сакрушальны ўдар па ідэалогіі і практыцы контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызма, па ідэалогіі і практыцы нацыянал-фашызма, па іх антысавецкіх і інтэрвенцыяністкіх планах.

Яшчэ і яшчэ раз неабходна падкрэсліць, што справа не вырашаецца толькі адным апублікаваннем дэкрэта; зроблен толькі пачатак гэтай вялікай палітычнай справы. Тое аднадушнае адабрэнне, якім сустрэлі рэформу пролетарыі, калгаснікі і совецкая інтэлігенцыя нашай краіны — красамоўны паказальнік таго, што пачатак зроблен правільна, што курс узят беспамылкова.

Перад нашымі навуковымі, перад нашымі культурнымі сіламі, перад нашымі паэтамі і пісьменнікамі, перад нашымі настаўнікамі стаіць задачы найбольшай палітычнай важнасці. Агульнымі сіламі ўзяцца за далейшую распрацоўку пытанняў беларускага правапіса, разгарнуць на заводах і фабрыках, у саўгасах і калгасах, у школе самую шырокую прапаганду, раз'яснене палітычнай сутнасці нашай рэформы, прыцягнуць да гэтай справы ўсю пролетарскую грамадскасць, і поўны поспех нам забяспечан.

У якасці актуальнейшай, першаступеннай важнасці задачы перад нашымі совецкімі вучонымі, перад нашымі пісьменнікамі стаіць задача

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы